***Н. В. Смірнова***
*Навук. кір.* ***А. В. Брадзіхіна,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ЖАНРАВА-ФАРМАЛЬНЫЯ НАВАЦЫІ Ў ПАЭЗІІ Э. АКУЛІНА

Жанр, як і форма, падпарадкоўваецца пэўным стылёвым і вобразным законам. Вызначым карэляцыю паміж гэтымі паняццямі. Згодна з «Літаратуразнаўчым слоўнікам» В. П. Рагойшы, «жанр літаратурны – гістарычна акрэслены, адносна ўстойлівы тып мастацкай формы, дзе структура пэўных фармальных прыкмет (архітэктанічных, вобразных, моўных) выяўляе больш-менш канкрэтны мастацкі сэнс, а кожная жанравая форма звязана з пэўным зместам» [1, с. 89].

Вялікае значэнне для сучаснай беларускай літаратуры мае зроблены Э. Акулінымунёсак у справу пашырэння нязвыклых для айчыннага паэтычнага мастацтва форм, што асабліва заўважна ў другім зборніку паэта – «Крыло анёла». Гэта разнастайныя ўсходнія (туюг, газель) і еўрапейскія (віланэль, рытурнэль, канцона, рандо і інш.) жанрава-фармальныя структуры. Паэт не з'яўляецца тут першаадкрывальнікам, але імкнецца працягваць працу па рэцэпцыі іншых культурных з'яў, распачатую славутымі папярэднікамі. Пры гэтым яго «запазычанні» маюць выразныя адзнакі беларускасці.

Асабістым вынаходніцтвам паэта з'яўляецца такі жанр, як акрапаэма, што ўтрымлівае ў сабе рысы акраверша, эпічнасць паэмы і адсылае да класічнай традыцыі санета. Прыкладам з'яўляецца твор «Шлях да Радзімы», дзе ў якасці пазнавальнай рысы акраверша выкарыстоўваюцца радкі санета славутага папярэдніка і сапраўднага наватара ў галіне паэтычнага жанру М. Багдановіча («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі…»). Таму па шырыні поглядаў і значнасці для станаўлення айчыннай літаратуры магчыма правесці параллель паміж гэтымі двума майстрамі беларускага слова.

Такім чынам, айчынная літаратура на сучасным этапе перажывае працэс пашырэння ў галіне жанраў. Э. Акуліна ў гэтым сэнсе можна назваць наватарам, бо ён імкнецца пазычыць і пераасэнсаваць іншакультурныя формы, аздобіць іх нацыянальным каларытам. Выпадае адзначыць і такі факт, што імя Э. Акуліна даволі часта сустракаецца ў «Літаратуразнаўчым слоўніку» В. П. Рагойшы з нагоды ілюстравання той ці іншай экзатычнай формы, што сведчыць пра відавочную ролю паэта ў развіцці нацыянальнай культуры.

**Літаратура**

1 Рагойша, В. П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці / В. П. Рагойша. – Мінск: Народная асвета, 2009. – 303 с.

***М. Д. Ткаченко***
*Науч. рук.* ***Т. Н. Усольцева,***
*канд. филол. наук, доцент*

## ЗНАЧЕНИЕ ЧИСЕЛ В «ПИКОВОЙ ДАМЕ» А. С. ПУШКИНА

Числа играют значительную роль в художественном тексте и несут не меньшую смысловую нагрузку, чем другие образы и символы. Числам свойственны архаичные значения и мифологические представления, связанные с их употреблением, что способствует возникновению многочисленных версий по поводу цели использования чисел в рамках рассматриваемой повести. Числа 3, 7, 1 и 11 являются обозначениями трёх карт в составе сюжета «Пиковой дамы». Стоит отметить, что число «три» встречается на протяжении всей повести, являясь упоминаемым в деталях не только наименований карт, но и обозначая количество человек, понятий, условий, часов, дней и недель. Было

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

обнаружено, что автор мог также не употреблять непосредственно число три, а маскировать его под хронологией событий. А. С. Пушкин число три применяет не только в сюжете, но и в композиции повести: «Пиковая дама» состоит из шести глав (два раза по три), и в третьей главе происходит ключевой момент произведения. Вероятно, тройка была введена Пушкиным с целью усиления напряжения при прочтении «Пиковой дамы», а также для напоминания читателю о важности роли карт в повести.

Обращаясь к вопросу семантики и цели введения в текст других чисел произведения, стоит обратить внимание на две версии. Одна из них, выдвинутая В. Блекловым, предполагает, что Пушкин выразил в «Пиковой даме» заговор Екатерины II против Павла I и зашифровал в ней дату Александровского переворота. М. Зверева в своей версии опирается на религиозное значение чисел в картах и приходит к выводу, что персонаж повести Герман играет не картами, а понятиями, скрывающимися в них [1]. Таким образом, можно сделать вывод, что, несмотря на глубокое расследование тайной символики «Пиковой дамы», учёные до сих пор так и не могут прийти к точному и единому мнению. Что касается числовой семантики данной повести, ей уделено немного больше внимания, чем в остальных произведениях А. С. Пушкина в связи с её явной символической направленностью, но, тем не менее, данная тема всё равно пока не раскрыта до конца и требует дополнительного изучения.

**Литература**

1 Зверева, М. М. Тайный смысл «Пиковой дамы» А. С. Пушкина / М. М. Зверева // Академическая издательская группа Nota bene. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.nbpublish.com/view_post_30.html. – Дата доступа: 10.05.2011.

***Г. М. Чучвага***
*Навук. кір.* ***В. А. Ляшчынская,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА НАЗОЎНІКАВЫХ ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ ДЛЯ НАЙМЕННЯ ЧАЛАВЕКА

Фразеалагізмы валодаюць асаблівым, у параўнанні са словам, спецыфічным значэннем, якое прынята называць фразеалагічным. Пры выяўленні спецыфікі фразеалагічнага значэння неабходна перш за ўсё абапірацца на тыя элементы моўнай структуры, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у рэалізацыі значэння фразеалагізма [1, с. 133].

Сярод назоўнікавых фразеалагізмаў выдзяляецца група адзінак, якія выступаюць назвай-характарыстыкай асобы. Назва можа быць матывавана рысамі характару, інтэлектуальнымі здольнасцямі, статусам у грамадстве і некаторымі іншымі паказчыкамі.

Намі выдзелена 11 фразеалагічна-семантычных груп у назоўнікавых фразеалагізмах, якія выкарыстоўваюцца для найменне асобы: 1) паводле ўласцівасцей характару чалавека (62 адзінкі): *мокрая ануча; базарная баба; гуляй-вецер;* 2) паводле ўласцівасцей інтэлекту (25 адзінак): *светлая галава; кацялок варыць; Алёша з батонамі*; 3) паводле дзеяння і яго характарыстыкі (23 адзінкі): *хросны бацька; злы геній; пуцяводная зорка*; 4) паводле фізічных якасцей (16 адзінак): *божы адуванчык; вярста каломенская; хоць сабак вешай*; 5) паводле дасведчанасці, ступені майстэрства, спрактыкаванасці ў якой-небудзь справе (13 адзінак): *стары верабей; стрэляны верабей; біты воўк*; 6) паводле ролі ў грамадстве, становішча сярод іншых людзей (13 адзінак): *вясельны генерал; важная птушка; першая скрыпка*; 7) паводле сваяцкіх адносін (11 адзінак): *начная зязюля; свая кроў; дарагая палавіна*; 8) паводле прафесійнай прыналежнасці (10 адзінак): *блакітныя берэты; марскі воўк; папяровая душа*; 9) паводле падабенства да іншых людзей (9 адзінак): *сіямскія блізняты; белая варона; свая сястра;*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ